# НА АСНОВЕ ЎЗАЕМАРАЗУМЕННЯ І СЯБРОЎСТВА

## будзе развівацца дыялог нашай краіны з замежнымі партнёрамі

**Беларусь гатова разглядаць любыя новыя ідэі і праекты з іх боку. Пра гэта заявіў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка, прымаючы даверчыя граматы паслоў замежных дзяржаў.**

Звяртаючыся да дыпламатаў, Аляксандр Лукашэнка прыцягнуў увагу да некаторых аспектаў так званай эканамічнай дыпламатыі. «Беларусь вельмі зацікаўлена ў пашырэнні замежных гандлёва-эканамічных сувязяў», — падкрэсліў беларускі лідар. «Мы нацэлены як на ўмацаванне ўзаемавыгадных кантактаў з традыцыйнымі эканамічнымі партнёрамі, так і на асваенне новых рынкаў для дыверсіфікацыі не толькі нашага экспарту, але і ўсіх нашых адносін», — адзначыў Прэзідэнт Беларусі. На яго думку, гэта з'яўляецца асновай стабільнасці эканомікі і павышэння ўзроўню жыцця грамадзян. «Балазе, што і ў Еўрасаюзе, і ў Злучаных Штатах Амерыкі разгледзелі нашу міралюбівую палітыку, вывучылі яе і зрабілі выснову, што з Беларуссю трэба не проста супрацоўнічаць, а выкарыстоўваць Беларусь так, каб у нашым рэгіёне быў мір і парадак. Мы ў гэтым напрамку гатовы працаваць», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Прымаючы даверчыя граматы Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Злучанага Каралеўства Вялікабрытаніі і Паўночнай Ірландыі ў Беларусі Фіёны Гіб, Прэзідэнт адзначыў, што Беларусь разлічвае на актывізацыю сувязяў з Вялікабрытаніяй. «Нам трэба пераадолець нейкую псіхалагічную мяжу ў нашых адносінах, паглядзець, можа быць, новымі вачыма адзін на аднаго і знайсці тыя пазітыўныя напрамкі, па якіх мы абавязкова павінны супрацоўнічаць», — сказаў ён.

Звяртаючыся да пасла Аўстрыі ў Беларусі Бернда Аляксандра Баерля, беларускі лідар адзначыў, што нацыянальным інтарэсам Беларусі адпавядаюць пазітыўныя дынамічныя адносіны з Аўстрыяй. Прэзідэнт Беларусі выказаў надзею, што адкрыццё пасольства ў Мінску надасць адчувальны імпульс узаемавыгадным кантактам у гандлёва-эканамічнай і крэдытна-інвестыцыйнай сферах. Звяртаючыся да пасла Швейцарскай Канфедэрацыі ў Беларусі па сумяшчальніцтве Андрэя Мотыля, Прэзідэнт адзначыў: «Наша зацікаўленасць у больш шырокай прысутнасці швейцарскага бізнесу ў Беларусі застаецца нязменнай». На думку кіраўніка беларускай дзяржавы, нягледзячы на стабільныя кантакты са Швейцарскай Канфедэрацыяй, існуе велізарны нерэалізаваны патэнцыял эканамічнага ўзаемадзеяння, які патрабуе прыняцця дадатковых намаганняў.

Прымаючы даверчыя граматы пасла Албаніі ў Беларусі па сумяшчальніцтве Арбена Газіёні, Аляксандр Лукашэнка адзначыў гатоўнасць Беларусі да актыўнага супрацоўніцтва з Албаніяй не толькі ў сферах культуры, навукі і адукацыі, але і ў прамысловасці, сельскай гаспадарцы. Паводле яго слоў, перспектыўным бачыцца ўсталяванне кааперацыі паміж дзелавымі коламі двух краін.

Вітаючы новага пасла Індыі ў Беларусі Панкаджа Саксена, Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што Беларусь разлічвае на істотную актывізацыю гандлёва-эканамічнага партнёрства. Ён адзначыў высокую выніковасць нядаўняга візіту Прэзідэнта Індыі ў Беларусь. Беларускі лідар выказаў надзею, што новы пасол Індыі прыкладзе максімум намаганняў да напаўнення дамоўленасцяў на вышэйшым узроўні канкрэтнымі справамі. На яго думку, яшчэ адной важнай задачай з'яўляецца рэалізацыя падпісанай падчас візіту на вышэйшым узроўні дарожнай карты беларуска-індыйскага супрацоўніцтва.

«Развіццё ўсебаковых адносін з Венесуэлай з'яўляецца адным з прыярытэтных напрамкаў нашай знешняй палітыкі ў Лацінскай Амерыцы», — падкрэсліў Прэзідэнт Беларусі, прымаючы даверчыя граматы Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Балівaрыянскай Рэспублікі Венесуэла ў Беларусі Хасэ Багіяна Перычы. Аляксандр Лукашэнка пацвердзіў гатоўнасць нашай краіны прыняць з візітам Прэзідэнта Венесуэлы Нікаласа Мадура паводле дамоўленасці падчас сустрэчы ў Маскве ў маі 2015 года, паведамляе прэс-служба беларускага лідара. «Што б ні адбывалася сёння ў сяброўскай і блізкай нам Венесуэле, вы павінны быць цвёрда ўпэўнены: мы непахісна будзем прытрымлівацца таго курсу, які мы вызначылі разам з камандантэ Чавесам».

У якасці перспектыўнага партнёра ў Паўднёвай Амерыцы Беларусь разглядае і Перу. Беларуская тэхніка добра знаёмая перуанскім спажыўцам з часоў СССР, яна адрозніваецца аптымальнымі суадносінамі цаны і якасці. «Мы гатовыя пастаўляць у Перу шырокую гаму машынабудаўнічай прадукцыі і высокатэхналагічнага абсталявання», — сказаў кіраўнік беларускай дзяржавы. Ён падкрэсліў, што Беларусь таксама гатова купляць і прадукцыю з Перу, у тым ліку для паставак у іншыя дзяржавы.

Прымаючы даверчыя граматы Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла ПАР у Беларусі па сумяшчальніцтве Намасонта Марыі Сібанда — Тусі, Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што Беларусь дастаткова эфектыўна развівае супрацоўніцтва з дзяржавамі поўдня Афрыкі, перш за ўсё з Паўднёва-Афрыканскай Рэспублікай. Паводле яго слоў, рэалізуецца шэраг перспектыўных праектаў, якія тычацца паставак высакаякаснай беларускай тэхнікі. Акрамя таго, прапрацоўваюцца іншыя кірункі ўзаемадзеяння. Беларускі лідар пацвердзіў запрашэнне Прэзідэнту Паўднёва-Афрыканскай Рэспублікі Джэйкабу Зуму наведаць з візітам Беларусь.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што для Беларусі важна знаходзіць новых партнёраў у Афрыцы. Ён выказаў упэўненасць, што Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Сьера-Леонэ ў Беларусі па сумяшчальніцтве Ямбасу Джон Сар Франсіс будзе ўсяляк садзейнічаць асваенню патэнцыялу двухбаковага супрацоўніцтва. Прымаючы даверчыя граматы пасла КНДР у рэспубліцы Беларусь па сумяшчальніцтве Кім Хён Чжуна, Аляксандр Лукашэнка пацвердзіў нацэленасць Беларусі на развіццё ўзаемавыгадных адносін ва ўсіх сферах.

Звяртаючыся да паслоў, кіраўнік дзяржавы адзначыў, што для пленнага выканання іх дыпламатычнай місіі ў Беларусі будуць створаны самыя спрыяльныя ўмовы. «Вельмі важна, каб падчас свайго знаходжання тут вы змаглі знайсці новыя магчымасці, быць можа, новыя фарматы ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва і прыўнесці канструктыўныя ідэі ў нашу сумесную працу», — сказаў беларускі лідар. «Перакананы, што наш дыялог з дзяржавамі, якія вы прадстаўляеце, будзе пастаянна развівацца на аснове ўзаемаразумення, партнёрства і сяброўства», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. Ён звярнуў увагу, што гэты год у Беларусі аб'яўлены Годам культуры, і гэтая сфера на працягу дванаццаці месяцаў будзе насычана разнастайнымі мерапрыемствамі. Прэзідэнт выказаў надзею, што дыпламаты знойдуць магчымасць бліжэй пазнаёміцца з Беларуссю, яе прыродай, кліматам, культурнай спадчынай, гісторыяй.

■ Адзнака

## НА КАРЫСЦЬ АГУЛЬНАЙ СПРАВЫ

**Учора ранкам у Нацыянальнай акадэміі навук былі ўшанаваны дыпломамі пераможцаў журналісты, якія пішуць на тэму навукі. У намінацыі «найлепшая публікацыя» прэміі конкурсу былі прысуджаны адразу дваім супрацоўнікам «Звязды» — рэдактару аддзела адукацыі Надзеі НІКАЛАЕВАЙ і спецыяльнаму карэспандэнту аддзела навін і рэпартажаў Яраславу ЛЫСКАЎЦУ.**



Фота Сяргей НІКАНОВІЧ.

Дыпломы пераможцам уручыў старшыня прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі акадэмік Уладзімір ГУСАКОЎ.

— Пра навуку піша вялікая група журналістаў, якія папулярызуюць нашу працу (а распрацоўкі ў нас проста прарыўныя). Гэта вельмі важна і для Акадэміі навук, і для грамадства. Мы заўсёды адкрыты для журналістаў, — адзначыў на ўрачыстай цырымоніі **старшыня прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук акадэмік Уладзімір ГУСАКОЎ**. — На конкурс было прадстаўлена больш за 90 работ 25 аўтараў. Кожная з вылучаных была адпраўлена камісіяй на экспертнае заключэнне спецыялістаў па тэматыцы работы, заключэнні экспертаў заслуханы на пасяджэнні камісіі па прысуджэнні прэмій, і канчатковае рашэнне было прынята на бюро прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Адбор быў дастаткова жорсткім. І ў ліку пераможцаў апынуліся сапраўды самыя лепшыя публікацыі журналістаў.

Яшчэ раз віншуем калег з заслужанай узнагародай і зычым не спыняцца на дасягнутым!

■ Погляд

## Войны далёкія і блізкія



Заява кіраўніка Пентагона, якая прагучала 22 студзеня 2016 года ў выданні Politico, пра тое, што **амерыканцы плануюць вярнуць у Ірак** адно са сваіх найбольш баяздольных падраздзяленняў — **101-ю паветрана-дэсантную дывізію** — для наземных баёў супраць групоўкі «Ісламская дзяржава», здзівіла многіх. Гэта вельмі няпростая ініцыятыва для ЗША. Апытанні грамадскай думкі сведчаць пра незадаволенасць простых амерыканцаў вопытам папярэдніх ваенных кампаній у Іраку і Афганістане, якія абышліся ў трыльёны долараў бюджэту і каштавалі некалькіх тысяч забітых амерыканскіх вайскоўцаў. Вядома, Прэзідэнт ЗША, які пакідае свой пост, можа дазволіць сабе невялікую вайну пад канец кар'еры, але яна, хутчэй за ўсё, негатыўна адаб'ецца на шанцах кандыдата ад дэмакратычнай партыі зноў заняць прэзідэнцкі пост. Не прыходзіцца чакаць таксама, што сіл адной дывізіі акажацца дастаткова для перамогі там, дзе не спраўляецца цэлая іракская армія, якую гадамі трэніравалі і ўзбройвалі самі ж амерыканцы. Новая ініцыятыва можа стаць пачаткам новай тактыкі — адправіць спачатку адну дывізію, а калі яна не справіцца, папрасіць кангрэс аб пасылцы дадатковых салдатаў ёй на дапамогу. Таксама міністр абароны ЗША заявіў у інтэрв'ю CNBC, што хацеў бы адправіць амерыканскіх ваеннаслужачых і ў сірыйскую Раку.

Як і трэба было чакаць, Расія расцаніла новую ініцыятыву ЗША як спробу перахапіць у яе сітуацыю ў барацьбе з тэрарызмам на Блізкім Усходзе. Заяву пра гэта зрабіў кіраўнік камітэта Дзярждумы па міжнародных справах Аляксей Пушкоў. У самім Іраку няўзгодненую з ім заяву амерыканцаў таксама сустрэлі халаднавата. Міністр замежных спраў Ірака Ібрагім аль-Джаафары заявіў пра намер Ірака весці барацьбу з тэрарыстамі «рукамі іракскіх сіл», без замежнага ўмяшання. Відавочна, што чаша цярпення ўлад Ірака перапоўнена пасля аналагічнага выпадку ў мінулым снежні, калі Турцыя без узгаднення з урадам Ірака ўвяла свае войскі на тэрыторыю нафтаноснага Масула.

У суседняй Сірыі з'явіліся першыя прыкметы таго, што **ваенная аперацыя, якую Расія правяла ў верасні 2015 года, пачынае прыносіць свой плён**, ствараючы неабходную падтрымку для ўрадавай арміі. Сірыйскія ўрадавыя войскі адбілі ў баевікоў стратэгічны горад Ар-Рабія і пасёлішча Ар-Роуда ў правінцыі Латакія. Калі сірыйскай арміі ўдасца развіць поспехі, магчымай стане і сухапутная ваенная аперацыя Расіі на тэрыторыі краіны. Асабліва ўлічваючы свежую ініцыятыву амерыканцаў у Іраку.

Пасля адмены міжнародных санкцый супраць Ірана на фоне заявы МАГАТЭ 16 студзеня аб прыняцці краінай неабходных мер па спыненні сваёй ядзернай праграмы ён пачаў выкарыстоўваць новую сітуацыю для аднаўлення пазіцый на сусветнай арэне. 22 студзеня адбыўся **першы за чатырнаццаць гадоў візіт старшыні КНР у Тэгеран**. Падчас яго было падпісана 17 пагадненняў аб супрацоўніцтве і была пастаўлена задача нарасціць за наступныя дзесяць гадоў тавараабарот у дзесяць разоў, да 600 мільярдаў долараў. Бакі ахарактарызавалі свае адносіны як стратэгічнае партнёрства. Можна чакаць, што значная частка тых дадатковых аб'ёмаў нафты, якія будуць выкінуты Іранам на сусветны рынак у наступныя месяцы пасля адмены санкцый, будзе набыта менавіта Кітаем. Гэта самы значны шанц іранцаў нарасціць свой экспарт у Кітай, які мае патрэбу ў сыравіне, каб вырабляць прамысловыя тавары для сябе і многіх краін свету. У гэты ж дзень заява аб адмене санкцый супраць Ірана была зроблена і Японіяй, якая, у адрозненне ад Кітая, не паспела скарыстацца новай сітуацыяй для ўмацавання сваіх адносін з Тэгеранам.



На мінулым тыдні Расія і ЗША працягнулі абмен ударамі ў рамках халоднай вайны, якая ўзнавілася з 2014 года. У адказ на закрыццё Амерыканскага цэнтра ў Маскве і 28 яго філіялаў у Расіі **амерыканскія ўлады адклікалі акрэдытацыю ў ганаровых консульстваў Расіі** ў Каліфорніі, Мінесоце, Пуэрта-Рыка, Фларыдзе і Юце. Пры гэтым Расія прадоўжыла нарошчваць свае ўкладанні ў амерыканскія каштоўныя паперы, што было б немагчыма ў гады ранейшай халоднай вайны, калі эканоміка СССР была фактычна ізалявана ад заходняй, за выключэннем невялікага тавараабароту. У лістападзе 2015 года Масква на шэсць мільярдаў долараў павялічыла ўкладанні ў казначэйскія аблігацыі ЗША US Treasuries.

Галоўнай геапалітычнай падзеяй для Беларусі на тыдні стала зацвярджэнне **новай ваеннай дактрыны** 22 студзеня. Мір змяняецца, і меры па ваеннай бяспецы трэба змяняць, каб яны адэкватна забяспечвалі бяспеку краіны і жыхароў. У прыватнасці, Прэзідэнт Беларусі звярнуў асаблівую ўвагу на тое, што на змену традыцыйным формам вайны прыйшлі іншыя, у тым ліку так званыя гібрыдныя. У іх значна павысілася роля інфармацыйных рычагоў уздзеяння на фарміраванне грамадскай думкі ў той або іншай дзяржаве. А гэта патрабуе гнуткай стратэгіі для адэкватнага рэагавання.

**Сяргей КІЗІМА,**
**доктар палітычных навук**